# Крок да незалежнасці




На працягу двух месяцаў будзе праходзіць сумесная акцыя раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і аддзела па кінавідэаабслугоўванні Стаўбцоўскага раёна па прафілактыцы алкагалізму і папярэджанні суіцыдаў.

У праграме – наведванне больш за 40 прадпрыемстваў і арганізацый раёна. У ходзе акцыі спецыялісты аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі тэрытарыяльнага цэнтра Ілона Кухарчык, Зінаіда Катлашэўская, Сяргей Есіс, псіхолаг Юлія Кандраціна выступаюць з тэматычнымі лекцыямі ў калектывах. Кожная сустрэча суправаджаецца паказам фільма «Незалежнасць» (12 крокаў на шляху ад алкагольнай залежнасці да незалежнасці).